*А.М. Макарэвіч* (Магілёў)

# ПРАЦА НАСТАЎНІКА І ВУЧНЯЎ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЎРОКАЎ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ І РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ (5-6 класы, тэарэтычны аспект)

Сістэма перспектыўных ліній (СПЛ) – набор алгарытмаў у метадычных і навучальных дзеяннях настаўніка і вучняў, якая, акрамя іншага, прадугледжвае паэтапнае і сістэмнае фарміраванне ўменняў падрыхтоўчай працы да выканання творчай работы з паэтапным ускладненнем форм працы і адпаведных ім уменняў. У 5-6 класах фарміруюцца першапачатковыя ўменні самастойнай работы з літаратурным творам на перспектыву яго характарыстыкі на адпаведных уроках і выканання творчай работы па ім. У сувязі з гэтым вельмі важна менавіта на гэтым этапе літаратурнай адукацыі паказаць вучням, як можна рацыянальна арганізаваць іх самастойную і на ўроку беларускай літаратуры працу, каб дасягнуць максімальныя вынікі ад яе на бліжэйшых уроках, пры выкананні дамашніх заданняў да наступных ўрокаў. Зыходзячы з гэтага, прапануем тэарэтычныя зыходныя па арганізацыі вывучэння твораў для пазакласнага чытання (ПЧ) у цеснай сувязі з працэсам вывучэння твораў для абавязковага чытання (ТАЧ) у кантэксце ўзаемазвязанага (лагічнага, паслядоўнага) выхаду на ўрокі развіцця маўлення (РМ) па сістэме перспектыўных ліній (СПЛ – больш падрабязна пра гэта ў: [2, с. 64-65]).

**1. Вызначэнне твораў для чытання на ўроках ПЧ.** «Вучэбная праграма...» па беларускай літаратуры [1], «Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне...» (ПКТП) [напрыклад – 3] не вызначаюць канкрэтна творы для ўрокаў ПЧ. Тым не меней, важна вызначыць крытэрыі падбору твораў для гэтых урокаў у 5-6 класах. Яны могуць быць наступнымі. **А)** Сувязь твораў для ПЧ з творамі для абавязковага вывучэння (на ўзроўні тэматыкі і праблематыкі, мастацкіх вобразаў. **Б)** Наяўнасць у творах для ПЧ таго матэрыялу, які можа быць выкарыстаны вучнямі ў якасці ўзору для формы творчай работы (на ўзроўні сюжэта, кампазіцыі) альбо фактычнага матэрыялу для творчай работы (выказванне на падставе сюжэта самастойна прачытанага твора, выкарыстанне ў творчай вучнёўскай рабоце адпавед-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных вобразаў, прыёмаў іх раскрыцця з твора для ПЧ). Магчымы варыянт выніку прапанаванага вышэй працэсу падбору твораў для ПЧ у 5-6 класах можа быць наступным. *Пяты клас:* Уладзімір Дубоўка. «Як сінячок да сонца лётаў», Янка Брыль. «Цюцік», Карусь Каганец. «Скрыпач і ваўкі», Уладзімір Караткевіч. «Чортаў скарб». *Шосты клас*: Людміла Рублеўская. П'еса-казка «Янук, Рыцар Мятлушкі», Віталь Вольскі. Апавяданні з кнігі «Падарожжа па краіне беларусаў», Андрэй Федарэнка. Аповесць «Афганская шкатулка», Васіль Вітка. Апавяданне «Трывога ў Ельнічах».

**2. Вылучэнне блокаў урокаў: урокі вывучэння ТАЧ + УПЧ + УРМ.** Пасля выбару твораў для ПЧ настаўнік зможа вылучыць блокі ўрокаў (пра гэта ў: [2, с. 66-67]) і акрэсліць СПЛ у іх межах. Вызначэнню зместу СПЛ у дадзеным выпадку дапаможа наступнае: **а)** аналіз дыдактычных задачах, якія акрэсліваюцца ПКТП для адпаведных раздзелаў вучэбнага дапаможніка, **б)** суаднясенне гэтых задач са зместам, мастацкімі асаблівасцямі твораў для ПЧ з мэтай выяўлення таго, што дапаможа эфектыўна і нязмушана (для вучняў) развіваць уменні, на фарміраванне якіх арыентуе ПКТП; **в)** праекцыя сутнасці ўменняў, якія павінны быць сфарміраваны ў адпаведнасці з задачамі ўрока РМ, зместу творчых вучнёўскіх работ на вывучаемы ў адпаведным блоку ўрокаў матэрыял твораў; мэта такой праекцыі – выяўленне тых этапаў, у працэсе здзяйснення якіх можна праводзіць эфектыўную паралельную падрыхтоўку да адпаведнага ўрока РМ.

**3. Падрыхтоўка настаўнікам заданняў і пытанняў па творах для ПЧ.** На гэтым этапе важна падрыхтаваць і своечасова прапанаваць вучням такія заданні і пытанні, якія дапамогуць школьнікам у працэсе чытання твораў для ПЧ найбольш эфектыўна засвоіць яго мастацкі матэрыял і адначасова паралельна назапашваць веды, якія будуць спрыяць засваенню матэрыялу ўрокаў вывучэння ТАЧ, а таксама назапашваць адпаведны матэрыял для ўрокаў ПЧ і РМ.

**4. Распрацоўка і планаванне этапаў падрыхтоўкі да ўрокаў РМ.** Этапы: **а)** своечасовае аб'яўленне задання па чытанні мастацкага твора, заданняў і пытанняў па ім, тэм сачыненняў і іх планаў; **б)** вызначэнне мэтаў, часу і форм кантролю за чытаннем твора; **в)** характарыстыка перспектыў выкарыстання назапашанага пры чытанні твора матэрыялу на ўроках вывучэння ТАЧ, ПЧ і РМ; **г)** нормы ацэнкі творчых работ. Тэмы сачыненняў варта сфармуляваць такім чынам, каб кожная з іх адпавядала тэме ўрока па творы. Варта ўлічваць пры выбары тэм сачынення ўзровень падрыхтаванасці вучняў. Так, напрыклад, у 6-м класе па аповесці «Насцечка» К. Чорнага можна прапанаваць наступныя тэмы сачыненняў. **А.** Асаблівасці канфлікту паміж героямі аповесці К. Чорнага «Насцечка». **Б.** Праяўленні характару літаратурных герояў у розных эпізодах аповесці К. Чорнага «Насцеч-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ка». **В.** Мае адносіны да вобразаў і падзей аповесці К. Чорнага «Насцечка». **Г.** Характарыстыка вобраза Насцечкі з аднайменнай аповесці К. Чорнага. **Д.** Характарыстыка вобраза Сержа з аповесці К. Чорнага «Насцечка». **Е.** Характарыстыка вобразаў старэйшага пакалення ў аповесці К. Чорнага «Насцечка». **І.** Мае ўражанні і вывады па аповесці К. Чорнага «Насцечка». **Планы сачыненняў,** складзеныя з улікам тэм і зместу ўрокаў па адпаведным творы, дазваляюць рацыянальна і сістэмна арганізаваць працу як настаўніка, так і вучняў. Настаўнік пры гэтым мае магчымасць, па-першае, рацыянальна планаваць канкрэтныя ўрокі ў сістэме перспектыўных ліній, па-другое, пры праверцы сачыненняў на адну і тую ж тэму вытрымліваць адзіны падыход пры ацэнцы ўзроўню раскрыцця тэмы. Вучні, атрымаўшы планы сачыненняў па творы, да чытання якога яны прыступаюць, маюць магчымасць, *па-першае*, успрымаючы падзеі і вобразы твора, праводзіць адначасовую паралельную падрыхтоўку і да ўрокаў па творы і да выканання творчай работы па ім; *па-другое*, на ўроку, які сваім зместам адпавядае тэме сачынення, рабіць паралельныя назапашванні да творчай работы. Такім чынам здзяйсняецца не эпізадычная і раптоўная, а комплексная падрыхтоўка як настаўніка, так і вучняў да ўрока па РМ і творчай работы па ім. Акрамя вызначанага вышэй, разгорнутыя планы сачыненняў, калі яны выкарыстоўваюцца сістэмна, ускосна супрацьстаяць імкненню вучняў выдаць за ўласныя запазычаныя з інтэрнэта, друкаваных зборнікаў тэксты сачыненняў.

**Арганізацыя чытання і асэнсавання вучнямі мастацкіх твораў у СПЛ:** урокі вывучэння ТАЧ – урокі ПЧ – РМ. За некалькі тыдняў да першага ўрока вывучэння ТАЧ (калі на яго адводзіцца некалькі гадзін), урока ПЧ варта зарыентаваць вучняў на чытанне адпаведнага мастацкага тэксту. Пры гэтым мэтазгодна па ўроках вывучэння ТАЧ аб'явіць тэмы сачыненняў і прапанаваць вучням раздрукаваныя і электронныя варыянты планаў сачыненняў, растлумачыць парадак (алгарытмы) рацыянальнай працы на перспектыву з мастацкім тэкстам; па ўроку ПЧ прапанаваць заданні і пытанні па творы, зарыентаваць на тое, што з яго вучні могуць выкарыстаць у працэсе падрыхтоўкі да ўрока РМ.

Прапанаваныя тут метадычныя парады пры ўмове іх сістэмнага выкарыстання і паступовага пашырэння алгарытмаў дзейнасці вучняў змогуць стаць грунтоўным падмуркам для эфектыўнай працы школьнікаў на далейшых этапах атрымання літаратурнай адукацыі: 7 – 9, 10 – 11 класы.

**Літаратура:**

1. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V – XI класы / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 128 с.
2. *Макарэвіч, А.М.* Творы беларускай дзіцячай літаратуры ў кантэксце ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення ў пятым класе (Агульнаметадычны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аспект) / А.М. Макарэвіч // Веснік МДУ імя А.А. Куляшова. – 2012. – № 1 (39) – С. 64-72.

3. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» на 2010/2011 навучальны год (V клас агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання) // – Электронны рэсурс. – Рэжым доступу: http://www.adu.by/modules.php?name=News&file=article&sid=6603. – Дата доступу: 24.02.2012.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова